СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ ● ПАЛАЖЭННЕ АБ САЦСПАБОРНІЦТВЕ НА ЛЕПШУЮ КАМСАМОЛЬСКУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СБА ДА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА ● СЕСІЯ Ў БДУ ● ВЫНІКІ КОНКУРСУ НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ І НАСЦЕННАГА ДРУКУ ● АЛІМПІЙСКІМ АБ'ЕКТАМ — КАМСАМОЛЬСКІ КЛОПАТ І ЎВАГУ ● СПОРТ ● ГУМАР

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (1189) ● 12 студзеня 1978 г. Цана 2 кап.

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# Ідэйна-палітычнае выхаванне: праблемы і задачы

**Нядаўна ва універсітэце адбыўся сход партыйнага актыву, на якім было абмеркавана пытанне «Аб ходзе выканання комплекснага плана ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на пяцігадовы тэрмін навучання».**

**З дакладам на сходзе выступіў сакратар партыйнага камітэта БДУ М. С. ГАРАШЧУК. У спрэчках па дакладу выступілі: намеснік сакратара партбюро філфака Л. П. МАКСІМАВА, сакратар партбюро хімфака Г. Л. ШЧУКІН, прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню У. С. БАГДАНАЎ, старшыня мясцкома П. А. ДУБАВЕЦ, дэкан біяфака А. Ц. ПІКУЛЕЎ, намеснік сакратара партбюро фізфака С. С. ШУШКЕВІЧ, прарэктар па рабоце з замежнымі студэнтамі І. П. ЧЭПА, сакратар камітэта камсамола А. А. ТОЗІК, рэктар БДУ У. М. СІКОРСКІ.**

**На сходзе прысутнічалі В. П. КУЗЬМЯНКОЎ — намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ, Б. А. САЎЧАНКА — першы сакратар Маскоўскага райкома КПБ г. Мінска, Т. М. ДЗМІТРЫЕВА — намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Г. С. МАРОЗ — загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага гаркома КПБ, М. С. МАРЦІНОВІЧ — намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага абкома КПБ, С. А. МАЛЕВІЧ — начальнік аддзела Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.**

**Сёння мы друкуем вытрымкі з даклада сакратара парткома БДУ М. С. ГАРАШЧУКА.**

Вышэйшая школа краіны назапасіла вялікі вопыт арганізацыі і правядзення ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі. Аднак мы разумеем, што сучасны этап камуністычнага будаўніцтва патрабуе далейшага ўдасканальвання якасці прафесіянальнай падрыхтоўкі, значнага павышэння ідэйна-палітычнага ўзроўню будучых спецыялістаў, фарміравання ў кожнага выпускніка актыўнай жыццёвай пазіцыі. Выпускнік ВНУ павінен быць чалавекам высокай культуры, шырокай марксісцка-ленінскай эрудыцыі.

Ва універсітэце з улікам вопыту мінулага, патрабаванняў сучаснасці, інтарэсаў будучага прыведзен у стройную лагічную сістэму ўвесь назапашаны арсенал сродкаў, метадаў і форм выхавання, створана «Комплексная праграма ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на пяцігадовы перыяд навучання».

**У галіне ідэйна-палітычнага выхавання, фарміравання камуністычнага светапогляду студэнтаў робіцца многае на ўсіх факультэтах. Гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў пастаянным клопаце з боку партыйных бюро аб павышэнні якасці выкладання грамадскіх навук. З канкрэтных мерапрыемстваў у гэтым напрамку належыць адзначыць практыку перыядычнага абмеркавання на сумесных пасяджэннях партыйных бюро і кафедр грамадскіх навук пытанняў па вывучэнню студэнтамі гэтых дысцыплін. На фізічным факультэце вясной 1977 года абмяркоўвалася пытанне выкладання палітэканоміі. У лютым гэтага года плануецца правесці сумеснае пасяджэнне кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў і партыйна-камсамольскага актыву фізфака. Аналагічныя абмеркаванні праводзяцца і на іншых факультэтах.**

Акрамя ўдасканалення традыцыйных форм навучання студэнтаў сацыяльна-эканамічным дысцыплінам, развіваюцца новыя. Атрымала развіццё навукова-даследчая работа студэнтаў па грамадскіх дысцыплінах.

У мінулым годзе кафедры грамадскіх навук правялі вялікую работу па напісанню рэфератаў студэнтамі па тэматыцы, прысвечанай 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Разам з тым гэта работа застанецца незавершанай і можа не атрымаць далейшага развіцця, калі аслабіць да яе ўвагу. Камітэту камсамола належыць узяць на ўлік усіх студэнтаў, якія падрыхтавалі добрыя даклады, уключыць іх у састаў лектарскіх груп і прыцягнуць да чытання лекцый і правядзення гутарак з працоўнымі Мінска, рэспублікі і ў сваіх калектывах.

**Вялікія магчымасці для выхавання ў студэнтаў патрыятызму, пачуцця гонару за сваю Радзіму маюцца пры вывучэнні новай Канстытуцыі СССР.**

**У комплекснай праграме выхаваўчая работа ў вучэбным працэсе на ўсіх курсах прадугледжвае вызначэнне сацыяльнага і светаўспрымальнага аспектаў агульнатэарэтычных і спецыяльных дысцыплін. Мы зыходзім з таго, што выхаваўчыя магчымасці маюцца не толькі ў выкладанні грамадскіх навук, а і такіх, як матэматыка, фізіка, хімія і інш.**

**Вывучэнне праблемы ўмелага выкарыстання выхаваўчых магчымасцей у працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін і ёсць адзін з паказчыкаў комплекснага падыходу да выхаваўчай работы.**

Патрэбна адзначыць, што ў апошні час мы прыкметна ўзмацнілі ўвагу да гэтага пытання. Так, у гэтым навучальным годзе на многіх кафедрах, партыйных бюро і сходах мехмата, фізфака, біяфака, юрфака і іншых факультэтаў абмяркоўвалася пытанне «Аб ідэйнай накіраванасці вучэбнага працэсу». На наш погляд, назапашан ужо вялікі вопыт у гэтым напрамку на біялагічным, фізічным і іншых факультэтах.



Выступае М. С. Гарашчук. Фота В. ДРАЧОВА.

Разам з тым мы не выкарыстоўваем яшчэ ўсіх магчымасцей выкладчыкаў прыродазнаўчых дысцыплін для ідэйнага выхавання студэнтаў як у вучэбным працэсе, так і ў пазавучэбны час. Пры гэтым трэба мець на ўвазе наступныя абставіны. За апошнія гады ў грамадстве адбываюцца вялікія змены, істотна павялічваецца атрад спецыялістаў прыродазнаўчых, дакладных і тэхнічных навук. Метадалагічная іх падрыхтаванасць павінна заключацца ў правільным спалучэнні работы па спецыяльнасці з ідэйнай падрыхтоўкай.

Важнае выхаваўчае значэнне мела б выступленне вядомых вучоных прыродазнаўчых навук перад студэнтамі па асобных пытаннях унутранай і знешняй палітыкі нашай партыі. Асабліва важным было б выступленне вучоных па вывучэнню і прапагандзе новай Канстытуцыі СССР.

У фарміраванні камуністычнага светапогляду, павышэнні ідэйна-палітычнага ўзроўню студэнтаў важнае месца займаюць Ленінскі залік, грамадска-палітычная практыка, правядзенне палітінфармацый і іншыя мерапрыемствы.

Між тым, у многіх гэтых справах у нас няма пэўнай, адладжанай сістэмы. Часам мерапрыемствы праводзяцца на нізкім узроўні. Так, палітінфармацыі часта зводзяцца да пераказу матэрыялаў, апублікаваных у газетах, без усебаковага абмеркавання.

**Нам неабходна ўвесці ў сістэму перыядычныя выступленні на факультэтах кваліфікаваных лектараў па знешняй і унутранай палітыцы нашай партыі. Узровень гэтых лекцый павінен быць такім, каб студэнты ахвотна іх наведвалі.**

**Пакуль мы рэдка арганізуем выступленні прадстаўнікоў рэктарата, парткома, кіруючых работнікаў партыйных і савецкіх органаў горада і рэспублікі перад студэнтамі і прафесарска-выкладчыцкім саставам. Нам неабходна эфектыўней выкарыстаць сістэму палітычнага інфармавання студэнтаў і выкладчыкаў.**

Важнае месца ў комплекснай праграме ідэйна-выхаваўчай работы займае грамадска-палітычная практыка. Распрацавана, абмеркавана на факультэтах, адобрана саветам універсітэта і амаль год дзейнічае «Палажэнне па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна». Створаны і працуюць савет універсітэта і савет факультэтаў па ГПП.

Кожны студэнт у адпаведнасці з яго асабістым комплексным планам атрымлівае заданне па ГПП. Па выніках выканання яе студэнтам I курса выстаўляецца залік, II—V курсаў — адзнака.

**На гістарычным, юрыдычным, біялагічным факультэтах вядзецца мэтанакіраваная работа па арганізацыі ГПП, на механіка-матэматычным, ФПМ, фізічным і хімічным факультэтах яна яшчэ не ўзнялася да патрабуемага ўзроўню.**

**Шмат памылак дапускаецца пры атэстацыі студэнтаў. Так, у мінулым годзе на шэрагу факультэтаў былі створаны атэстацыйныя камісіі. Але бывала, што куратар адзін праводзіў атэстацыю ў групе, назіраліся лібералізм і завышэнне адзнак.**

**Вялікая работа праводзіцца ў нас па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Значны ўклад у гэтую справу ўносяць ваенная кафедра, бібліятэка і камітэты камсамола факультэтаў. Яны арганізуюць канферэнцыі чытачоў, сустрэчы з Героямі Савецкага Саюза, аўтарамі ваенных мемуараў, ветэранамі партыі. Нам патрэбна і далей развіваць работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў.**

Важнай састаўной часткай ідэйна-выхаваўчай работы з'яўляецца інтэрнацыянальнае выхаванне студэнцкай моладзі. Ва універсітэце ёсць вялікі вопыт арганізацыі інтэрнацыянальнай работы са студэнтамі. Асабліва належыць сказаць аб філалагічным факультэце. У мінулым навучальным годзе на базе філалагічнага факультэта было праведзена 13 інтэрнацыянальных агульнагарадскіх і універсітэцкіх вечароў, прысвечаных юбілейным датам нашай Радзімы і замежных краін.

Вядома, што унутраныя магчымасці, таленты і здольнасці людзей, іх творчы патэнцыял з найбольшай паўнатой раскрываюцца ў працы. Выхаванне ўнутранай патрэбы працаваць з'яўляецца асновай фарміравання ўсебакова развітога чалавека, духоўна багатай асобы.

У комплекснай праграме прыкметнае месца займаюць мерапрыемствы па працоўнаму, прафесіянальнаму выхаванню студэнтаў. Трэба заўважыць, што «працоўнае выхаванне» тут выступае шырэй паняцця «выхаванне працай» або «выхаванне ў працы». Як гэта ўжо адзначалася, выхаваўчая работа ў вучэбным працэсе на ўсіх курсах прадугледжвае і выдзяленне сацыяльнага і светаўспрымальнага аспектаў агульнатэарэтычных і спецыяльных дысцыплін.

**Моладзь у большасці сваёй паступае да нас з гарачым і шчырым жаданнем працаваць. Аднак нельга не заўважаць таго, што ўжо з першых курсаў некаторыя маладыя людзі сутыкаюцца з пэўнымі цяжкасцямі, губляюць жаданне вучыцца.**

**У чым жа справа? Пэўна, нам неабходна больш праводзіць гутарак і акцэнтаваць увагу нашых студэнтаў на тое, што праца — вучоба не заўсёды, асабліва на першых курсах, з'яўляецца задавальненнем. Разам з тым трэба паказаць, што праца з'яўляецца непарушнай грамадскай неабходнасцю як для грамадства, так і для самога чалавека, яго асабістага шчасця. Вынікі праверкі гавораць, што такіх гутарак у нас амаль няма.**

У арганізацыі працоўнага выхавання ва ўмовах вышэйшай школы належыць абавязкова мець на ўвазе шэраг праблем, якія паўсталі ў гэтым напрамку ў апошнія гады. Нам неабходна выхоўваць творча мыслячых спецыялістаў, прафесіянальна і псіхалагічна падрыхтаваных вучыцца усё жыццё, павышаць сваю кваліфікацыю. Верны шлях да дасягнення гэтай мэты ляжыць праз далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай працы. А гатоўнасць да творчасці належыць выхоўваць як мага раней. Канешне, далёка не ўсе першакурснікі могуць быць далучаны хоць у нейкай меры да даследаванняў. Размова ідзе аб тым, каб забяспечыць высокую якасць ведаў фундаментальных дысцыплін, выпрацаваць у кожнага студэнта трывалыя навыкі рашэння практычных, пастаянна ўскладняючыхся задач.

На наш погляд, вучэбнаму працэсу, яго арганізацыі і аптымізацыі трэба ўдзяляць больш увагі, павысіць узровень чытання лекцый, асабліва на першых курсах. Вельмі важна пры ацэнцы ўзроўню і методыкі выкладання канкрэтных дысцыплін улічваць і думкі студэнтаў. Заслугоўвае ўвагі штогод праводзімы на механіка-матэматычным факультэце аналіз анкет па ацэнцы студэнтамі якасці выкладання ўсіх дысцыплін. Анкеты дапамагаюць удасканальваць вучэбны працэс.

Важнай формай павышэння актыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу з'яўляецца прадастаўленне права добра паспяваючым студэнтам займацца па індывідуальнаму плану. На жаль, гэтая вельмі важная форма навучання і выхавання пакуль не атрымала распаўсюджання.

(Заканчэнне на 2-й стар.).



Да адказу рыхтуецца Ларыса Галаскон.

# Цікавае пачынанне

Вядома, што першы год навучання для студэнтаў асабліва цяжкі і складаны. Як дапамагчы першакурсніку хутчэй стаць свядомым членам маналітнага, дружнага калектыву факультэта, азнаёміцца з новай формай навучання, знайсці грамадскую работу адпаведна сваім здольнасцям і патрабаванням? Гэта адна з асноўных задач камітэта камсамола факультэта.

— Якая работа вядзецца камітэтам камсамола з першым курсам? — з такім пытаннем я звярнулася да сакратара камітэта камсамола мехмата Аляксандра Казуліна.

— Па-першае, хочацца адзначыць такі факт, што ў камітэт камсамола ад першага курса ўваходзяць тры чалавекі: Валерый Анісін, Марына Табачка і Алена Насаева. Гэта і вялікае давер'е і не меншая адказнасць. Дзякуючы гэтаму першакурснікі змогуць адразу ж уключыцца ў грамадскую работу. Па-другое. Пры камітэце камсамола працуе школа камсамольскага актыву, вучоба ў якой праводзіцца 1—2 разы ў месяц. Акрамя гэтага, за кожнай акадэмічнай групай замацаван грамадскі куратар. Адказная за работу грамадскіх куратараў Вольга Кошалева.

У чым заключаюцца функцыі грамадскіх куратараў? Па якіх асноўных якасцях іх падбіраюць? — на гэтыя пытанні я папрасіла адказаць В. Кошалеву.

— Грамадскія куратары — гэта, у асноўным, старшакурснікі. Студэнты, якім ёсць чым падзяліцца і ў галіне вучобы, і ў практыцы камсамольскай дзейнасці. Асноўныя задачы, якія сталіся перад імі, наступныя: дапамагчы бюро групы ў складанні планаў работы, распрацоўцы тэматыкі камсамольскіх сходаў, растлумачыць, як патрэбна весці неабходную дакументацыю. А таксама пазнаёміць першакурснікаў з асновамі студэнцкага жыцця.

Многае ўжо зроблена ў гэтым плане. Для першакурснікаў былі падрыхтаваны сустрэчы з выдатнікамі вучобы, праведзены гутаркі аб гісторыі БДУ.

Галоўная задача кожнага студэнта — вучоба. Таму вялікую ўвагу ў сваёй рабоце грамадскія куратары ўдзяляюць паспяховай здачы сесіі. Пастаянна праводзіцца праверка наведвання заняткаў і паспяховасці студэнтаў. Для першакурснікаў чытаецца спецыяльны цыкл лекцый — «Вучыся вучыцца». Перыядычна ў «баявых лістках» абвяшчаецца, як абстаяць справы ў кожнай з груп.

Сярод лепшых куратараў можна назваць Таню Гурвіч, Свету Атамановіч, Наташу Букель, Люду Хвашчынскую. Дзяўчаты не чакаюць падказак, а праяўляюць самастойнасць і ініцыятыву, даручаную справу выконваюць з камсамольскай адказнасцю.

Работа распачата вельмі патрэбная. Вынікі яе падводзіць сесія.

Л. ПАЎЛЮЧЫК.

## СЕСІЯ СЕСІЯ

# НІ ПУХУ, НІ ПЕР'Я, СТУДЭНТ!

Я ўжываюся ў атмасферу сесіі. Хаджу па аудыторыях, дзе засталіся пасля залікаў лісткі з адказамі — учарашнія шчаслівыя імгненні. Дзверы ў надпісах— «Асцярожна, экзамен прымае...» Услухоўваюся ў гудзенне калідораў, дзе больш формул, пытальнікаў і клічнікаў, чым звычайных слоў. І жадаю камусьці: «Ні пуху!»

На юрфаку гавораць: студэнты сесію вытрымаюць, вытрымалі б выкладчыкі. Людміла Аляксееўна толькі што прымала залік у адной групы, зараз яе чакае другая. Вечарам прыйдзе частка трэцяй. Цяжка.

Да заліку засталіся лічаныя хвіліны. Староста экстэрнам фарміруе пяцёрку мацнейшых. А выкладчык звыкла тасуе «картачную калоду» білетаў. Дзе шчаслівыя? У каго зараз на руках «козыры»? Другакурснікі, якія здаюць Людміле Аляксееўне Прыходзька, дацэнту кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва залік па дзяржаўнаму праву замежных сацыялістычных краін, лічаць, што галоўнае не шчаслівыя білеты, а шчаслівыя адказы. А яны залежаць ад узроўню ведаў.

«Першая ластаўка» — Жэня Цімафееў пачаў адказваць упэўнена. Зараз студэнт — той жа спартсмен на дыстанцыі. Мабілізаваць усе сілы, вытрымку, веды, вопыт, паспець рэалізаваць шанс на перамогу — такая яго задача.

«Адказ вычарпальны»,— каменціруе выкладчык і ставіць у залікоўку аўтограф. Жэня задаволен — усмешка хаваецца ў вусах. Таварышы за дзвярыма цiснуць руку, і калідор на момант ператвараецца ў гаманкі кірмаш па абмену думкамі.

А за экзаменацыйным сталом разыгрываецца другая з трыццаці «партый» па сістэме «пытанне — адказ».

Прадмет, які здаюць сёння другакурснікі юрфака, складаны. У ім шмат матэрыялу для запамінання, трэба добра ведаць дзяржаўнае права больш чым дзесяці краін, іх гісторыю. Але чым складаней прадмет, тым большае задавальненне ад таго, што здолееў вытрымаць залік або экзамен.

— Вытрымала!

Шчаслівая Наташа Камалава закрывае залікоўку.

— Наташа, ці задаволена ты сваім адказам?

— Увогуле, так. Перад залікам я хацела адказваць іменна на тыя пытанні, якія трапілі ў білет. Як бачыце, існуе тэлепатыя.

— Як ты рыхтавалася да заліку?

— У мяне сістэма простая: чытаю канспект лекцый, чытаю падручнік, а напярэдадні экзамена звязваю веды, пачэрпнутыя з гэтых крыніц, у адзінае цэлае.

— У студэнта шмат якасцей. Але якую ты лічыш галоўнай у час сесіі?

— Уменне правільна размеркаваць свае сілы і час на падрыхтоўку да экзаменаў і залікаў.

Я пажадала Наташы такога ж добрага адказу на наступным выпрабаванні — гэта будзе экзамен па адміністрацыйнаму праву.

А за экзаменацыйным сталом залік трымае Сяргей Мінееў. Ён строга аперыруе тэрміналогіяй: сёння імправізаваць не дазваляецца, і вольнасці стылю трэба захаваць на потым. Галоўнае — лагічна, сцісла і правільна адказаць па білету. Сяргей прыйшоў на юрыдычны факультэт з падрыхтоўчага аддзялення. А выбраў прафесію юрыста ў час службы ў радах Узброеных Сіл СССР. Пакуль — не расчараваўся, наадварот, жаданне працаваць іменна ў гэтай галіне ўзмацнілася. Сённяшні паспяхова здадзены залік наблізіў Сяргея да здзяйснення мары.

Гэтак жа паспяхова абмінула «падводныя рыфы» заліку і Алена Фралова. Яна расказвала пра канстытуцыю Венгрыі і канстытуцыйныя суды Югаславіі.

— Лена, чым гэты залік адрозніваўся ад астатніх?

— Сваёй цяжкасцю. Можна сказаць, гэта самы сапраўдны экзамен.

— І якой жа была першая думка, калі ты ўбачыла, што вытрымала яго?

— Я падумала: якое сёння цудоўнае надвор'е, абавязкова пайду гуляць па горадзе.

Залік працягваецца. Гартаюцца падручнікі і канспекты, на стале выкладчыка памяншаецца стос білетаў — у экзаменацыйнай ведамасці павялічваецца колькасць запоўненых радкоў. І хаця за вокнамі мароз, тут, у аўдыторыі, горача. Тэмпература вышэй на пяць балаў.

Рэпартаж вяла
Н. НІКОЛІЧ.

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

### КОНКУРСУ НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ І НАСЦЕННАГА ДРУКУ, ПРЫСВЕЧАНАГА ПРЫНЯЦЦЮ НОВАЙ КАНСТЫТУЦЫІ СССР І 60-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Журы конкурсу на чале з доктарам філалагічных навук М. Я. Цікоцкім прызнала пераможцамі ПА РАЗДЗЕЛУ НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ:

— факультэт радыёфізікі і электронікі (І месца)
— фізічны і біялагічны факультэты (ІІ месца)
— гістарычны і філалагічны факультэты (ІІІ месца).

Конкурс паказаў значна ўзросшы ўзровень зместу і мастацкага афармлення нагляднай агітацыі. На ўсіх факультэтах БДУ на працягу года былі арганізаваны выстаўкі, афармлены стэнды, экспазіцыі, якія расказвалі аб асноўных этапах развіцця нашай краіны, аб поспехах савецкіх людзей у ажыццяўленні рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ.

На конкурс насценнага друку былі прадстаўлены газеты, якія выйшлі з пачатку навучальнага года да 7 лістапада. Факультэт журналістыкі выпусціў за гэты час 4 нумары і адзін літаратурны дадатак. Газета «Журналіст» вылучылася сярод іншых разнастайнасцю тэматыкі, вострай пастаноўкай актуальных пытанняў вучобы, грамадскага жыцця факультэта. Цікавымі з'яўляюцца газеты філалагічнага, радыёфізічнага і гістарычнага факультэтаў. Высокую культуру афармлення, змястоўнасць матэрыялаў мае «Віта» — газета біёлагаў. Аднак журы адзначыла, што гэтыя насценгазеты выпускаюцца некалькі ніжэй сваіх магчымасцей. Біёлагам пажадана павялічыць перыядычнасць выдання і расшырыць тэматыку выступленняў газеты (асабліва гэта датычыць асвятлення грамадскага жыцця факультэта).

Разнастайная тэматыка ў газеты фізічнага факультэта «За навуку». Аднак газета магла б быць і большай па аб'ёму, і часцей выходзіць, і ставіць вострыя злабадзённыя праблемы вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы, ды і афармляцца больш маляўніча. Гэтае ж датычыць насценгазет юрыдычнага і хімічнага факультэтаў, крыху здаўшых заваяваныя пазіцыі ў параўнанні з мінулым годам.

Насценгазеты астатніх факультэтаў некалькі аднастайныя па зместу, яны не ў поўнай меры адлюстроўваюць жыццё сваіх факультэтаў, выходзяць нерэгулярна.

У выніку ПА РАЗДЗЕЛУ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ месцы размеркаваліся наступным чынам:

— факультэт журналістыкі (І месца)
— факультэт радыёфізікі і электронікі і філалагічны факультэт (ІІ месца)
— гістарычны і біялагічны факультэты (ІІІ месца)
— фізічны факультэт (IV месца)
— юрыдычны факультэт (V месца)
— хімічны факультэт (VI месца)
— механіка-матэматычны факультэт (VII месца)
— геаграфічны факультэт (VIII месца)
— факультэт прыкладной матэматыкі (IX месца).

Здымкі зроблены В. ДРАЧОВЫМ на геаграфічным факультэце.



Залік прымае дацэнт Л. А. Гурыновіч.

# КАЛІ ТЫ ВЫДАТНІК

Выдатнік і яго роля ў грамадскім жыцці факультэта... Адны мяркуюць, што дастаткова першынства ў вучобе, а грамадскай працай няхай займаюцца іншыя. Другія выдатнікі не ўяўляюць сябе ў баку ад грамадскай работы і асноўнай мэтай яе лічаць павышэнне паспяховасці сваіх таварышаў па вучобе. На геаграфічным факультэце пераважная большасць выдатнікаў — з «другіх».

Расказвае адказная за работу выдатнікаў на факультэце, студэнтка ІІІ курса Людміла Яршова:

— У нас 35 выдатнікаў. Лепшым з лепшых на ўрачыстым пасяджэнні камітэта камсамола былі ўручаны ганаровыя знакі ЦК ВЛКСМ «За выдатную вучобу». Мы віншавалі іх як правафланговых у вучобе і грамадскай дзейнасці.

Асновы выдатнай вучобы закладваюцца, вядома, на І курсе. Паспяхова працуе ў нас лекторый для першакурснікаў «Вучыся вучыцца». Найцікавей імкнуліся расказаць аб універсітэцкім жыцці сваім малодшым таварышам грамадскія куратары — выдатнікі Н. Буднік, В. Басякова, Ю. Богдан, Т. Гусенда ў лекцыях «Твой родны універсітэт» і «Як рыхтавацца да сесіі».

Актыўна адгукнуліся мы на заклік савета выдатнікаў БДУ дапамагчы грамадскім падрыхтоўчым курсам у выкладанні асобных дысцыплін. Трое нашых студэнтаў выкладаюць на курсах геаграфію, іх праца ацэньваецца станоўча.

Кожнаму выдатніку — грамадскае даручэнне. Такая добрая традыцыя бытуе ў нас на факультэце, бо іменна ён, выдатнік, павінен іграць вядучую ролю ў павышэнні паспяховасці таварышаў па вучобе, у актывізацыі грамадскага жыцця навучальнай установы.

Л. БРЫЖЭВІЧ.



Апошняе ўдакладненне...

## Алімпійскім аб'ектам — камсамольскі клопат і ўвагу

# ПАЧЫН ФІЗІКАЎ ПАДХОПЛЕН

Больш месяца прайшло з таго часу, як камсамольцы фізічнага факультэта ўзялі шэфства над алімпійскімі аб'ектамі горада-героя Мінска. Зроблена ўжо нямала. Значную дапамогу аказалі студэнты фізфака ў збудаванні лёгкаатлетычнага манежа ў раёне парка Перамогі і на рэканструкцыі стадыёна «Дынама». На алімпійскіх аб'ектах адпрацавана 1097 чалавека-гадзін.

Пачын фізікаў знайшоў гарачую падтрымку ў камсамольскіх арганізацыях іншых факультэтаў. 15 снежня адбылося пасяджэнне бюро камітэта камсамола БДУ, на якім быў адобран пачын камсамольцаў фізічнага факультэта і рэкамендавана камітэтам камсамола факультэтаў падтрымаць ініцыятыву камсамольскай арганізацыі фізічнага факультэта аб шэфстве над будаўніцтвам алімпійскіх аб'ектаў пад дэвізам «Алімпійскім аб'ектам — камсамольскі клопат і ўвагу».

Эстафета пачыну была падхоплена камсамольцамі ФПМ і гістарычнага факультэта. Сур'ёзна аднесліся да гэтай важнай справы студэнты гістфака, якія добрасумленна працавалі на будаўніцтве лёгкаатлетычнага манежа і заслужылі падзяку будаўнікоў. Прыкладам у працы падавалі студэнты II курса Віктар Зань, Людміла Мароз, Анатоль Сверкуноў.

Але не ўсё ідзе так, як бы хацелася. Напрыклад, камсамольцы ФПМ аднесліся да адказнага пачынання фармальна. У выніку з-за няўвагі людзей былі сарваны чатыры рабочыя дні.

Цяпер работы часова спынены — у студэнтаў зімовая экзаменацыйная сесія. Але ўжо зараз на фізічным факультэце сфарміраваны два студэнцкія атрады, якія будуць працаваць у час зімовых канікул на алімпійскіх аб'ектах горада Мінска.

**В. ПАДВЕРБНЫ,**
**В. ЦЭКУНОЎ.**

# СПОРТ—ПЕРААДОЛЬВАННЕ ЦЯЖКАСЦЕЙ

**Вячаслаў ХАРУК займаецца на IV курсе геаграфічнага факультэта. Увесь вольны ад заняткаў час аддае любімаму віду спорту — класічнай барацьбе. Сур'ёзнасць, з якой Вячаслаў адносіцца да спорту, прынесла яму значны поспех — ён заваяваў званне майстра спорту. Вячаслаў — трохразовы пераможца усесаюзных маладзёжных турніраў, неаднаразовы чэмпіён першынства ВНУ БССР, член зборнай каманды БССР па класічнай барацьбе.**

**Мы сустрэліся з В. Харуком і папрасілі яго адказаць на некалькі пытанняў.**

**— Раскажы, калі ласка, як пачынаўся твой спартыўны шлях!**

— У школьныя гады я шмат займаўся фізкультурай. Прызнаюся, употай марыў аб вялікім спорце, уяўляў сябе моцным барцом... Але магчымасцей займацца іменна барацьбой спачатку не было. У секцыю я трапіў, калі працаваў на Мінскім трактарным заводзе.

Потым была армія. Гэтыя два гады прайшлі з вялікім плёнам для мяне. Я рэгулярна трэніраваўся, удзельнічаў у спартыўных спаборніцтвах ваеннай акругі.

Пасля арміі паступіў на геаграфічны факультэт БДУ.

**— Пэўна, тут былі створаны адпаведныя ўмовы для далейшага спартыўнага росту?**

— Вядома. Больш таго, іменна тут пачалася мая сапраўдная спартыўная кар'ера. Кожны студэнт нашага універсітэта пры жаданні мае магчымасць займацца у секцыі пад наглядам вопытных трэнераў. Трэнер — той жа выкладчык: ён і раскажа, і пакажа, і строга спытае «ўрок». Такімі трэнерамі сталі для мяне В. Рудэнкаў і В. Фефелаў.

**— Жыццё спартсмена — багатае на ўражанні, падзеі. Мяркуем, і табе, Вячаслаў, ёсць аб чым расказаць!**

— Шчыра кажучы, спорт для мяне — бясконцае пераадольванне цяжкасцей. Гэта не толькі ўпартая барацьба на дыване і моцныя сапернікі. Часам даводзіцца змагацца з сабой, прымушаць сябе працаваць.

Добра памятаю апошняе спаборніцтва. У лістападзе ў Гродна праводзілася чарговае першынство БССР па класічнай барацьбе. Удзельнічала больш як 20 чалавек, сярод іх — 15 майстроў спорту. Вядома, такі моцны састаў шмат што значыў — канкурэнцыя была вострай. На маю бяду, я адчуваў сябе не вельмі добра. Цяжка было настроіцца на барацьбу. Аднак здолеў перамагчы сябе і выйшаў на дыван сабраным. Фінальны паядынак усё ж прайграў былому студэнту БДУ М. Соцкаму. У выніку — другое месца.

**— Ці не перашкаджае спорт вучобе?**

— Наадварот, дапамагае. Спорт садзейнічае выхаванню такіх якасцей, як вытрымка, паслядоўнасць, воля і многіх іншых.

Зараз я здаю чарговую сесію. Пастараюся, каб у залікоўцы былі, як заўсёды, добрыя і выдатныя адзнакі.

**— 1978 год толькі пачаўся. Якія твае спартыўныя планы?**

— Хацелася б памерацца сіламі з вядомымі савецкімі спартсменамі на чэмпіянаце СССР.

Наперадзе — чарговае першынство па класічнай барацьбе паміж ВНУ БССР. Прыкладу ўсе намаганні, каб трымаць спартыўны гонар універсітэта на вышыні.

**Інтэрв'ю ўзялі**
**А. ВЫРВІЧ,**
**П. ВАСЮЧЭНКА.**



## Парады ўрача

# ТЭЛЕВІЗАР І ЗДАРОЎЕ

Стаміўся?.. Дык ідзі адпачні, паглядзі тэлевізар.

Магчыма, гэта і сапраўды выдатны адпачынак? Медыкі адказваюць на гэтае пытанне адмоўна. Больш таго, замежныя вучоныя ўстанавілі, што ў таго, хто праводзіць ля тэлевізара да 5 гадзін запар штодзённа, развіваюцца прыкметы «тэлевізійнай хваробы»: павышаная нервовасць, парушэнне зроку, сну і апетыту, стомленасць, болі ў жываце і паясніцы.

Прагляд тэлевізійных перадач — значная нагрузка для арганізма, асабліва для маладога, яшчэ не ўзмацнеўшага. А між тым спецыяльнымі даследаваннямі выяўлена, што школьнікі праводзяць перад экранам у сярэднім ад 12 да 24 гадзін у тыдзень. Гэта вельмі многа, калі ўлічыць, што ў старшакласнікаў вольнага часу застаецца 4—6 гадзін у суткі. І большую частку яго яны праводзяць ля «блакітнага экрана».

Захапленне тэлевізарам вядзе да заўчасных хвароб сэрца і сасудаў, нерваў, парушэння абмену рэчываў.

Пры разумных адносінах да «тэлеадпачынку» можна пазбегнуць усіх тых непрыемнасцей, аб якіх гаварылася вышэй. Вучоныя з Інстытута гігіены дзяцей і падлеткаў рэкамендуюць абмежаваць тэрмін штодзённага прагляду тэлевізійных перадач для вучняў малодшых класаў гадзінай, а для старшакласнікаў — дзвюма гадзінамі. Адлегласць да экрана павінна быць не менш 5—5,5 м. Ставяць тэлевізар павінен на ўзроўні вачэй сядзячага або крыху ніжэй. Лепш злёгку асвятляць памяшканне, тады вочы будуць менш стамляцца.

**В. МІКАЛАЕЎ,**
**урач.**

# КРАСВОРД

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** 4. Верш І. Нікіціна. 5. Персанаж трагедыі Шэкспіра «Атэла». 6. Форма запісу навуковай працы, вучонае сачыненне. 10. Горад, у якім праводзіўся X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. 13. Першы рэктар БДУ. 15. Характар апрацоўкі, які вызначае знешні выгляд тканіны, скуры і г. д. 18. Форма рэльефа ў выглядзе нагрувашчвання пагоркаў. 19. Спаборніцтва па грэблі.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** 1. Скошаны край друкарскага стэрэатыпа або клішэ. 2. Назва серыі савецкіх штучных спадарожнікаў Зямлі. 3. Падлетак на судне, малодшы матрос. 6. Дацкі фізік, адзін са стваральнікаў квантавай тэорыі. 8. Зварот. 9. Паўкаштоўны камень, разнавіднасць халцэдону. 11. Хваёвае дрэва. 12. Венгерскі кампазітар, піяніст, дырыжор XIX ст. 13. Від выяўленчага мастацтва. 14. Адзінка вымярэння работы і энергіі. 16. Светапогляд, перакананне. 17. Хімічны элемент, актыноід.



Склала
Н. МІКАЛАЕВА.

ГУМАР — ГУМАР

# Лёд зноў крануўся

Падыходзячы да аўдыторыі, у якой належала здаваць экзамен, Астап убачыў вялікі натоўп таварышаў па групе, якія чакалі сваёй чаргі. Большасць з іх, за выключэннем старасты, у якога ён атрымліваў стыпендыю, ды яшчэ двух-трох, у якіх ён пазычаў па паўрубля на піва, Астап бачыў упершыню. Бэндэр адразу ж кінуўся да дзвярэй, расштурхваючы усіх навокал:

— Таварышы, мне толькі троечку! Вось бачыце, я нават галёшы не зняў.

Натоўп шыпеў і не хацеў пускаць. Але Астап не здаваўся.

— Дзяўчына! Гэта не вы згубілі талон на Ландау? Спяшайцеся! Ён яшчэ ляжыць у кутку ля дэканата,— спяваў Бэндэр налева.

— Ну, ты, ахвяра ВВК, прапусці, табе гаворац! — крычаў ён направа. На шляху Астапа застаўся толькі намеснік старасты са спісам у руках.

— Вы тут не стаялі, — крычаў ён, — у мяне запісана.

— Кантора піша, — спакойна адказаў Астап, адкідваючы намесніка са спісам.

У гэты час дзверы адчыніліся і выйшаў студэнт Федзя. Усе позіркі звярнуліся да яго.

— Зусім азвярэў дацэнт, — заплакаў Федзя, — яшчэ, гаворыць, са шпорай злаўлю, дзе хош, гаворыць, знайду...

Не дагаварыўшы, Федзя закрыў твар залікоўкай і зарыдаў. Выкарыстаўшы гэтую замінку, Астап пранік у аўдыторыю.

Праз паўгадзіны дацэнт Сан Саныч дарма імкнуўся суняць торганне правага вока. Перад ім стаяў Астап і, не змаўкаючы, крычаў:

— Мне нельга двойку! Я бацька-адзіночка! Я вучыў па фізіцы Краевіча, а там такога няма! Я інвалід вышэйшай групы! Мой бацька турэцкападданы! Я адзін!..

Убачыўшы, што Сан Саныч запаўняе залікоўку, Астап на секунду спыніўся.

— Адзін мой знаёмы, Коля Остэн-Бакен, атрымаў у вас «добра»...

У дацэнта пачало торгацца і левае вока.

Праз некалькі хвілін Астап, насвістваючы мелодыю аргенцінскага танга, ішоў да раздзявальні. Вахцёры чыталі штотыднёвік «64» і спрачаліся аб шахматах.

У галаве вялікага камбінатара выспяваў новы план — як бы атрымаць стыпендыю.

**І. ІВАНОЎ.**

# СА СТУДЭНЦКАГА СЛОЎНІКА

Сярод слоў нашага студэнцкага лексікону нямала замежных. Большасць з іх — лацінскага паходжання. Гэта і не дзіўна: наша навуковая мова бярэ пачатак у сярэдневяковай Еўропе.

Калі літаральна перакладзіць словы на беларускую мову, то атрымаецца вось што:

дэкан — дзесятнік
канспект — нарыс
курс — бег
студэнт — старанна працуючы
сесія — сядзенне
экзамен — узважванне
факультэт — магчымасць.

Некалькі слоў маюць больш старажытнае, а іменна, грэчаскае паходжанне. Гэта **«дыплом» — «ліст, складзены ўдвая», «кафедра» — «крэсла».**

А вось слова **«шпаргалка»** прыйшло да нас з Польшчы. Яно азначае **«непатрэбная, спісаная папера».** Вось гэта ўжо зусім незразумела. Бо ў момант «узважвання» такая «папера», на жаль, можа стварыць цуд і наблізіць атрыманне «ліста, складзенага ўдвая».

**Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС: 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 09525 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 66.